# З першых рук

**80 лепшых беларускіх кніг папоўнілі Нацыянальную бібліятэку Польшчы. Яшчэ ў 2010 годзе міністэрствы культуры, інфармацыі ды замежных спраў ініцыявалі праект "Беларусь сёння" для папулярызацыі нашай краіны. І вось — вынік.**

Перадачу кніг арганізавалі наша Нацыянальная бібліятэка, Беларускі культурны цэнтр у Варшаве і міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы.

Уручаючы выданні Катажыне Сьляскай, намесніцы дырэктара польскай Нацыянальнай бібліятэкі, яе беларускі калега Аляксандр Суша выказаў надзею, што падарунак будзе спрыяць пашырэнню ведаў пра Беларусь у польскім грамадстве і лепшаму ўзаемаразуменню паміж нашымі народамі.

Добрая кніга — крыніца ведаў. І зброя супраць міфаў і стэрэатыпаў, якія, не сакрэт, існуюць у кожнай краіне пра іншыя народы. Галоўныя сховішчы ведаў краін-суседак дамовіліся часцей абменьвацца навінкамі, каб атрымліваць інфармацыю пра ўзаемныя дасягненні і спадчыну з першых рук.